# ДЗЕЯСЛОЎНЫЯ ПАРАЎНАННІ Ў ПАЭЗІІ СЯРГЕЯ ГРАХОЎСКАГА

***Ашомка М.В.*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік** – В.Я. Барысенка, канд. філал. навук, дацэнт*

Адной з распаўсюджаных груп сярод параўнанняў у творах Сяргея Грахоўскага з'яўляюцца дзеяслоўныя параўнанні. У залежнасці ад граматычнага афармлення дзеяслоўныя параўнанні дзеляцца на бяззлучнікавыя дзеяслоўныя параўнанні і злучнікавыя дзеяслоўныя параўнанні. Гэтымі тропамі арыгінальна перадаецца душэўны стан герояў, іх пачуцці і ўчынкі: *Тваіх "сумніцельных гасцей",* ***нібыта новыя вароты****, ён дзёгцем* ***мажа*** *ўсё гусцей* [1, с. 127]; *Наморшчыў лобік,* ***спахмурнеў****,* ***нібы*** *і* ***сапраўды паразумнеў*** [1, с. 132]; *Паэты з веку ў век* ***збіраюць*** *радкі,* ***як росы на траве****… Паэты рана паміраюць – Навек паэзія жыве* [3, с. 31]. Як бачна з прыведзеных прыкладаў, дзеяслоўныя параўнанні пабудаваны пры дапамозе злучнікаў *нібыта, нібы, як*. Змястоўныя дзеяслоўныя параўнанні стварыў Сяргей Грахоўскі для паказу герояў у сваіх вершах: *Пасля трывожнае разлукі і снегу Пушчын не атрос, схапіў таварыша на*



МГПУ им. И.П. Шамякина

*рукі і,* ***як дзіця****, у дом* ***панёс*** [3, с. 68]; *Звычайна памаўзлівы муж* ***выкручваецца, быццам вуж*** [2, с. 252].

Выкарыстоўваючы дзеяслоўныя параўнанні для характарыстыкі абстрактна-адцягненых паняццяў, паэт звязвае параўнанні з метафарамі, што значна ўзбагачае вобразы: *Самалёцік паволі ледзь* ***плыве, як сляпы****, і шматкроп'ем па полі разышліся слупы* [2, с. 18]; *Забілася сэрца: відаць, дарэмна ноч не спаў, – мой верш на тоненькай паперцы,* ***нібы вясновы снег, растаў*** [3, с 44]; *Яе* [вясну], ***нібы скульптуру, лепяць*** *тугія сінія вятры, пад ветразямі белы лебедзь плыве з далёкае пары* [3, с. 38]; *Я спадзяваўся некалі на ўдачы, наступнае* ***свяціла, як маяк,*** *але жыццё паставіла задачы, што аднаму не вырашыць ніяк* [3, с. 54]. У першым прыкладзе параўнанне ”плыве, як сляпы” перамяжоўваецца з метафарай ”разышліся слупы” – слупы, як жывая істота, якая накіроўвае жыццё людзей і нясе адказнасць за сваіх жыхароў, што дбаюць аб дабрыні і шчасці. У другім – метафара ”тугія сінія вятры” ўзмацняе параўнанне “нібы скульптуру, лепяць”, якое паказвае абуджэнне жыцця вясной. Трэці прыклад паказвае на пошукі ўдачы, якая не прыходзіць сама па сабе, бо “жыццё паставіла задачы”.

Прааналізаваны матэрыял дае магчымасць зрабіць вывад аб тым, што дзеяслоўныя параўнанні – прадуктыўны троп у мове твораў Сяргея Грахоўскага ў сувязі з тым, што дзеяслоў як намінатыўная адзінка мовы паказвае працэсы, дзеянні, рухі, перамяшчэнні і г.д.

**Літаратура**

1. Грахоўскі, С. Асеннія гнёзды : Кніга новых вершаў. – Мінск : Маст. літ., 1982. – 142 с.

2. Грахоўскі, С. Кругі на вадзе : Кніга новых вершаў, 1982 – 1984. – Мінск : Маст. літ., 1985. – 111 с.

3.Грахоўскі, С. Недапісаная кніга : Вершы. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 271 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина